най кніжкі Віленскай губерні», увёў у ёй неафіцыйную частку, дзе змяшчаў свае працы па гісторыі і этнаграфіі Беларусі і Літвы. З 1855 чл. Віленскай археал. камісіі, захавальнік Віленскага музея старажытнасцей. У Мінскім, Барысаўскім, Навагрудскім, Віленскім, Ашмянскім і Вілейскім паветах раскапаў каля 1000 курганоў. У 1859 заснаваў у Вільні друкарню і выдаў у ёй шэраг навук. і маст. кніг, у т.л. творы Ю.І.Крашэўскага, У.Сыракомлі, Ю.Ляскоўскага. У 1860—65 рэд. газ. *«Виленский вестник»*. У 1868—71 адзін з выдаўцоў газ. «Новое время» ў Пецярбургу. Выдаў зб. «На сёння» (т. 1—3, 1872), «Нарысы сучаснай рускай літаратуры» (1873), даследаванне «Пра літаратуру братніх славянскіх народаў» (1874), у якім змясціў нарыс па гісторыі бел. л-ры. У працах «Рэшткі язычніцкіх звычаяў на Беларусі» (1839), «Аб этнаграфічнай мяжы літоўскай і славянскай народнасцей у Літве» (1857), «Этнаграфічны погляд на Віленскую губерню» (1857—59), «Літоўскае Палессе» і «Беларускае Палессе» (у кн. «Жывапісная Расія», т. 3, ч. 1—2, 1882) сабраў звесткі пра гісторыю і прыроду Беларусі, адзначаў багацце матэрыяльнай і духоўнай культуры бел. народа, падкрэсліваў гіст. і этнаграф. своеасаблівасць беларусаў.

*Літ.*: Марціновіч А.А. Адзін з пачынальнікаў: Адам Кіркор // Хто мы, адкуль мы...: гіст. эсэ, нарысы: у 2 кн. Мінск, 1996. Кн. 1; Запрудскй И. «Да мілага пабачэння!»: к жизнеописанию А.Киркора // Нёман. 1998. № 10.

**КІРМА́Ш**, штогадовы святочны гандаль, сезонныя рынкі тавараў; штотыднёвыя таргі; храмавыя святы, якія арганізуюцца ў пэўным месцы ў пэўны час. Узніклі пры першабытна-абшчынным ладзе як форма абмену прадуктамі паміж плямёнамі. З перыяду Ранняга Сярэдневякоўя К. звычайна пачалі прымяркоўваць да рэліг. і інш. свят. Першыя К. ў ВКЛ дакументальна зафіксаваны прывілеямі Вільні (1441), Гародні (1496) і Полацку (1498). У Цэнтр. і Усх. Беларусі слова «К.» абазначала праваслаўнае (храмавае) свята і штогадовы святочны гандаль з забавамі. У Зах. Беларусі пад уплывам каталіцкай царквы за храмавымі святамі замацавалася назва «фэст». Іх арганізоўвалі ў дні хрысціянскіх свят (складаліся з богаслужэння, гандлю, калектыўных піроў і забаў). Пачынаючы з 18 ст. адбывалася спецыялізацыя К.: конныя, свіныя, жывёлагадоўчыя, рыбныя, грыбныя, ягадныя. У 16 ст. на К. узнік т.зв. кірмашовы тэатр, які ўключаў выступленні скамарохаў, дрэсіраваных мядзведзяў, вандроўных артыстаў, батлейкі, хароў нар. песні, інструм. ансамбляў. У Шклове ў маёнтку С.Зорыча ў час летніх К. наладжваліся водныя відовішчы з караблямі (імітавалі «марскія бітвы», напады на караблі «піратаў»). У канцы 19 — пач. 20 ст. на Віцебшчыне, Магілёўшчыне, Міншчыне на К. праводзілі конкурсы вясковых хароў, фалькл. ансамбляў, выканаўцаў прыпевак, у Полацкім павеце выступалі тэатралізаваныя муз. ансамблі. Распаўсюджанымі былі кірмашовыя спаборніцтвы вясковых асілкаў, барцоў, тэатралізаваная барацьба з пераапранутым мядзведзем, ладзіліся нар. гульні, забавы, карагоды, каруселі, гушканне на арэлях. З 2-й чвэрці 19 ст. на К. пашырыліся гандлёва-гульнявыя дзеі: аўкцыёны, прам. і с.-г. выстаўкі, латарэі ( кандытарская рулетка ў Івацэвічах, Пружанах, Целяханах; грашовая латарэя ў Лідзе, Браславе, Мінску; с.-г. ў Століне; рыбная ў Пінску; латарэя садавіны ў Мінску). У канцы 19 — пач. 20 ст. спецыфікай паратэатр. дзействаў бел. К. былі тэатралізаваныя гандлёвыя атракцыёны — рыбалкі (гарады Браслаў, Пінск, в. Кажан-Гарадок Лунінецкага р-на, г. Тураў Жыткавіцкага р-на). На сучасным этапе К., адроджаны на нац. глебе, стаў асновай правядзення свят на вольным паветры (раённыя, абл. і рэсп. «Дажынкі», «Каляды», «Масленіцы», святы нар. рамёстваў, гарадоў і вёсак, рэгіянальныя і міжнар. выстаўкі свецкага і рэліг. характару, спецыялізаваныя нац. таргі для розных этнічных груп насельніцтва і інш.). Спецыфікай пазагандлёвай часткі сучаснага К. з'яўляецца наяўнасць відовішчнай, спарт. і дзіцячай зон дзеяння, дзе побач з традыц. формамі кірмашовага тэатра суіснуюць сучасныя тэатр. і паратэатр. дзеі: конкурсы гумарыстаў, выканаўцаў прыпевак, сюжэтна-гульнявыя праграмы, тэатралізаваныя рыцарскія турніры, выступленні фалькл. калектываў, тэатраў нар. гумару, канцэрты прафес. артыстаў, танца. балі і інш.

*Літ.*: Гуд П.А. Беларускі кірмаш. Мінск, 1996.

*П.А.Гуд.*

**КІРМАШО́ВЫЯ ПЕ́СНІ**, абмежаваная група твораў, прымеркаваных да кірмашоў, пераважна восеньскіх, што адбываліся падчас хрысціянскіх свят. Жанравай прыкметай гэтых твораў з'яўляюцца паўсядзённыя, сямейна-быт. і бяседныя матывы. Умоўна падзяляюцца на 3 групы: песні пра падрыхтоўку да кірмашу, таргі на кірмашы і здарэнні пасля кірмашу. Падрыхтоўка да кірмашу часта раскрываецца ад першай асобы праз яе думкі, гасп. клопаты: У нядзелю на кірмаш // Я ж паеду гандляваці, // Ой, гандляваці, гандляваці // Сваю працу ўслаўляці. // Як прыеду на кірмаш // Буду я тавар наш // Добрым людзям прадаваці, // Ды і грошыкі збіраці. У некаторых песнях маці навучае дачку аб асцярожных паводзінах на кірмашы з малойцамі, «бо малойцы здрадныя людзі», «яны тваю русую касу, да гэй, растрапаюць», «яны тваё бела лічка, да гэй, памараюць». У песні «А жоначкі-лябёдачкі» апошнія, нягледзячы на цяжкую працу, рыхтуюцца на кірмашы «танцы станцаваць, свае байкі расказаць, шмат тавараў пакупляць, потым хлопцаў чараваць». У варыянтах К.п. «Баба Ева, дзед Тумаш» і «Кацярына і Тумаш» раскрываюцца розныя прыгоды персанажаў на кірмашы пасля продажу тавараў і выпіўкі «сіневару» ў шынку. У папулярнай у Беларусі К.п. «Ой, там, на таргу, на базары» разыгрываецца гу-

марыст. сцэнка продажу мужа жонкай: А мой мілы чарнабровы, // Да работы не лянівы — // Ён для мяне знадабіцца, // Ён пасее, паарэ, // Не для каго, для сябе, // А мой мілы, сэрданька // Пажалею я цябе! (Не прадам!). Знаходзяць у К.п. асвятленне і драм. калізіі, што здараюцца з героямі пасля кірмашу, у прыватнасці з нявесткай, якой не верыць свякроў: «Не скажа, што прадавала, // А скажа, што гуляла, // Не скажа, што ўмарылася, // А скажа, што лянілася». К.п. даволі сціплыя з пункту гледжання мастацкасці і вобразнасці, але яны з'яўляюцца прыкметнай з'явай песеннага фальклору беларусаў. *А.М.Аляхновіч.*

**КІ́РХА** (ад ням. Kirche царква), назва лютэранскага храма. Мае рысы, характэрныя для германскай готыкі — вострыя дахі і шпілі, стральчатыя вокны, пінаклі. Для інтэр'ераў большасці К. характэрны сціпласць і аскетызм. У Беларусі першыя К. ўзніклі ў 1550-я гг. (Бярэсце, Вільня). Вядомы К. ў Гродне, *Мінская кірха, Полацкая кірха.* *М.Г.Лаўрэцкі.*

**КІРЫ́ЛА І МЯФО́ДЗІЙ**, славянскія асветнікі, стваральнікі славянскай азбукі *кірыліцы*, прапаведнікі хрысціянства, першыя перакладчыкі рэліг. кніг з грэч. на слав. мову. Браты, нарадзіліся ў г. Салунь (цяпер Салонікі, Грэцыя). З дзяцінства валодалі грэч. мовай і дыялектам салунскіх славян паўд.-слав. групы. Большасць вучоных лічаць іх балгарамі.

К і р ы л а (да прыняцця манаства ў 869 — К а н с т а н ц і н; каля 827 — 14.2.869). Адукацыю атрымаў у Канстанцінопалі. Быў бібліятэкарам патрыярха Фоцця, потым выкладаў філасофію (за гэта празвалі Філосафам). Каля 860 з дыпламатычна-рэліг. місіяй пабываў у хазараў у грэч. калоніі Херсанес (Крым).

М я ф о д з і й (каля 815 — 6.4.885), быў на ваен. службе і на працягу 10 гадоў кіраваў адной з падуладных Візантыі слав.-балгарскіх абласцей. Затым прыняў пострыг і жыў у манастыры Паліхрон на беразе Мармуровага мора.

У 863 браты былі накіраваны ў Маравію для дапамогі кн. Расціславу ў пашырэнні хрысціянства. Перад ад'ездам Кірыла стварыў слав. азбуку (відаць, *глаголіцу*) і разам з Мяфодзіем пераклаў важнейшыя рэліг. кнігі з грэч. на *старaславянскую мову*. У Маравіі К. і М. працягвалі асветніцкую і перакладчыцкую дзейнасць. У Венецыі падчас дыспуту з трохмоўнікамі, якія прызнавалі літургію і л-ру толькі на грэч., лац. і яўр. мовах, Кірыла абараніў права славян на сваю мову. У 867 па выкліку папы Мікалая I прыбылі ў Рым, дзе Кірыла захварэў і памёр. Мяфодзій, пасвячоны ў сан епіскапа, вярнуўся ў Маравію і працягваў прапаведніцкую і перакладчыцкую дзейнасць. Былі створаны жыціі К. і М.; імёны братоў сталі сімвалам культ. еднасці і самастойнасці славян. Назва старaж. слав. азбукі «кірыліца» паходзіць ад імя Кірыла. Асветнікі фактычна сталі стваральнікамі літ. старaслав. мовы, зразумелай тады ўсім слав. народам. У Беларусі пра дзейнасць К. і М. ведалі ўжо з 11 ст. праз твор чарнарызца Храбра «О письменах» (перадрукаваны ў Вільні ў пач. 17 ст.) і жыціі К. і М. Асветнікі кананізаваны праваслаўнай царквой як Роўнаапостальныя К. і М., настаўнікі славенскія. 11 мая (ст. ст.), 24 мая (н. ст.) — Дзень Св. К. і М. ў Балгарыі, а з 1986 і ў слав. краінах СНД, у т.л. ў Беларусі, адзначаецца як дзень слав. пісьменства і культуры. Ушаноўваюцца як святыя і каталіцкай царквой. У Балгарыі існуе ордэн К. і М., якім узнагароджаны бел. літаратары П.Броўка, Н.Гілевіч, В.Нікіфаровіч.

*Літ.*: Сказания о начале славянской письменности. М., 1981. Б е р ш т е й н С.Б. Константин-философ и Мефодий. М., 1984; Жития Кирила и Мефодия. М., 1986; И с т р и н В.А. 1100 лет славянской азбуки. 2 изд. М., 1988.

**КІРЫ́ЛА КАЖАМЯ́КА**, К у р ы л а К а ж а м я к а, М і к і т а К а ж а м я к а, асілак, пераможца змея; вобраз чарадзейных усх.-слав., у т.л. і бел., казак і паданняў. У казках пра К.К. зліліся матывы міжнар. казачнага сюжэта і мясц. падання Кіеўскай Русі, якое сустракаецца ў *«Аповесці мінулых гадоў»*, «Ніканаўскім летапісе» і інш. Паводле гэтага падання, юны Кажамяка, які здольны разарваць сырамятную скуру, вырваць у быка на бягу кавалак шкуры, перамагае волата-печанега і здабывае перамогу на карысць Русі. У заключным эпізодзе некаторых казак асілак запрагае змея ў вял. плуг і робіць глыбокую баразну (аж да самага мора).



*Кірха ў Гродне.*